XXX ГОД БССР

9(47.60)
П16

П. ПАНАМАРЭНКА

# ТРЫЦЦАЦЬ ГОД СОВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў БЕЛАРУСІ

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1948

9(47.60)
П 16

П. ПАНАМАРЭНКА

# ТРЫЦЦАЦЬ ГОД СОВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў БЕЛАРУСІ

*Другое выданне*

Бр 6907
Президентская библиотека
Республики Беларусь
8 800000 975375
ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя палітычнай літаратуры
Мінск 1948 г.

## I

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя павярнула гісторыю на новы шлях, паклала пачатак крушэнню ўсёй сістэмы капіталізма, адкрыла новую эру ў гісторыі нашай краіны і ўсяго чалавецтва — эру комунізма.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя карэнным чынам змяніла лёс нашай краіны, звергла ўладу памешчыкаў і капіталістаў і ўстанавіла совецкую ўладу. Совецкая ўлада ў першыя-ж дні свайго існавання вырашыла самыя жыццёвыя, самыя насутныя пытанні для працоўных Расіі. Яна адабрала землі ў памешчыкаў і перадала іх у карыстанне сялянам, адабрала сродкі вытворчасці ў буржуазіі і ператварыла фабрыкі, заводы, землі, чыгункі, банкі ва ўласнасць усяго народа.

У выніку перамогі рэволюцыі ў нашай краіне ліквідаваны эксплаататарскія класы і пабудаван новы, нябачаны ў гісторыі, соцыялістычны грамадскі і дзяржаўны лад. Совецкая ўлада вырвала Расію з путаў імперыялізма, разбіла ланцугі матэрыяльнага і духоўнага прыгнечання нашай краіны заходнім імперыялізмам, выратавала яе ад угатованага ёй лёсу іншакраіннай калоніі, а нашых людзей — ад ператварэння ў каланіяльных рабоў.

Совецкая дзяржава прынесла нацыянальнае вызваленне ўсім народам Расіі, пабудавала многанацыянальную соцыялістычную дзяржаву, аснаваную на моцнай дружбе свабодных і роўнапраўных народаў.

Партыя Леніна — Сталіна, якая прывяла наш народ да перамогі над імперыялізмам, павяла яго па шляху соцыялістычнага будаўніцтва. Іменна таму ў найкарацейшыя гістарычныя тэрміны былі зроблены ў нашай краіне вялікія пераўтварэнні ва ўсіх галінах жыцця. Іменна таму совецкі

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

народ змог ператварыць дарэволюцыйную адсталую Расію ў магутную непераможную дзяржаву.

З таго часу, як 30 год назад у нашай краіне пераможна ўзняўся сцяг вялікай рэволюцыі і свет раскалоўся на дзве сістэмы, совецкі народ стаў вестуном вызваленчага руху ўсяго чалавецтва.

Совецкія людзі ператварылі ў жыццё заветныя мары прыгнечаных і абяздоленых аб грамадстве роўнапраўных і свабодных працаўнікоў і даказалі гістарычную асуджанасць загніваючай, раздзіраемай супярэчнасцямі капіталістычнай сістэмы, паказалі веліч магутнай развіваючайся соцыялістычнай сістэмы, усялілі ў сэрцы працоўных усіх краін надзею на вызваленне, паказалі ўсім народам свету шлях да вызвалення ад класавага і нацыянальнага прыгнечання.

Ленінізм, правераны гістарычным вопытам мільёнаў, згуртоўвае пад сваім сцягам усё новых і новых прыхільнікаў ва ўсіх краінах свету. Яго ідэі ўсё глыбей западаюць у свядомасць працоўных мас капіталістычнага свету, якія змагаюцца за сваё вызваленне.

Многа разоў аб'едноўваліся сілы старога свету, каб задушыць соцыялістычную дзяржаву рабочых і сялян. Многа разоў за мінулыя 30 год яны прадракалі блізкую гібель совецкай улады. Але гінула не совецкая ўлада, а яе ворагі.

Кіруемыя выпрабаванай і загартаванай у класавых бітвах партыяй большэвікоў, рабочыя і сяляне адстаялі совецкі лад у цяжкія гады ваеннай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны, калі полчышчы іншакраінных інтэрвентаў і белагвардзейскай контррэволюцыі з усіх бакоў насядалі на маладую совецкую рэспубліку. І ў наступныя гады ўсе намаганні іншакраінных імперыялістаў, рускай буржуазіі, кулацтва і іх агентуры — трацкістаў, зіноўеўцаў, бухарынцаў, буржуазных нацыяналістаў, якія імкнуліся аднавіць у нашай краіне капіталізм і ператварыць яе ў калонію, разбіліся аб несакрушальную магутнасць совецкага народа. Совецкі народ з чэсцю вышаў з самага цяжкага выпрабавання, якім была для нашай краіны Айчынная вайна з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Злосны вораг быў цалкам разгромлены.

Усімі сваімі дасягненнямі, у корані ператварыўшымі нашу краіну, Совецкі Саюз абавязан сваёй роднай вялікай партыі большэвікоў, вялікаму правадыру і любімаму настаўніку таварышу Сталіну.

Совецкі народ дабіўся вялікіх сусветна-гістарычных перамог таму, што ім кіруе слаўная большэвіцкая партыя, ство-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

раная Леніным і Сталіным. Следуючы ўсёперамагаючаму вучэнню Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна, партыя большэвікоў указала пролетарыяту і працоўным Расіі шлях да вызвалення. Цвёрда і ўпэўнена вяла большэвіцкая партыя рабочых і сялян на штурм капіталізма, на пабудову соцыялізма. Сваёй мудрай стратэгіяй, гібкай тактыкай, кіпучай рэволюцыйнай дзейнасцю большэвіцкая партыя пераадолела ўсе перашкоды на шляху да перамогі соцыялізма.

Слаўнае трыццацігоддзе совецкай дзяржавы з'яўляецца яркай дэманстрацыяй вялікай сілы большэвіцкай партыі і таржаства бяссмертных ідэй Маркса — Энгельса — Леніна — **Сталіна.**

## II

За 30 год совецкай улады наша краіна з адсталай, аграрнай Расіі ператворана ў перадавую, незалежную дзяржаву, у магутную дзяржаву з высокаразвітай соцыялістычнай індустрыяй і буйнай соцыялістычнай сельскай гаспадаркай.

Дарэволюцыйная Расія ў тэхніка-эканамічных адносінах на цэлае стагоддзе адставала ад перадавых капіталістычных краін. Каб дабіцца перамогі соцыялізма, трэба было перш за ўсё стварыць магутную перадавую індустрыю. Толькі гэта забяспечвала эканамічную самастойнасць нашай краіны і магло стварыць матэрыяльную базу для соцыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

Владзімір Ільіч Ленін гаварыў:

> «Рэволюцыя зрабіла тое, што ў некалькі месяцаў Расія па свайму *палітычнаму* ладу дагнала перадавыя краіны. Але гэтага мала. Вайна няўмольная, яна ставіць пытанне з бязлітаснай рэзкасцю: альбо загінуць, альбо дагнаць перадавыя краіны і перагнаць іх таксама і *эканамічна.* ...Загінуць або на ўсіх парах рушыць уперад. Так пастаўлена пытанне гісторыяй» *(Ленін, Выбр. творы, т. II. выд. 3, стар. 95).*

Апіраючыся на ўказанні В. І. Леніна, таварыш Сталін распрацаваў праграму соцыялістычнай індустрыялізацыі краіны.

Гістарычныя ўмовы існавання і развіцця совецкай краіны дыктавалі неабходнасць высокіх тэмпаў будаўніцтва цяжкай індустрыі.

Большэвіцкая партыя і совецкі народ пераадолелі і разграмілі ворагаў усіх масцей, якія імкнуліся затрымаць і сарваць індустрыялізацыю, імкнуліся ператварыць нашу краіну ў аграрны прыдатак капіталістычных краін і тым асудзіць

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

нашу Радзіму на адставанне, пазбавіць яе магчымасці арганізаваць рашучы адпор у выпадку ваеннага нападу са-зне.

Зараз ясна ўсім, што калі-б совецкая дзяржава не разгарнула хуткімі тэмпамі будаўніцтва цяжкай індустрыі, яна страціла-б сваю самастойнасць і стала-б цацкай у руках імперыялістычных сіл.

Совецкая дзяржава правяла індустрыялізацыю краіны, апіраючыся на свае ўнутраныя рэсурсы. Калі ў капіталістычных краінах індустрыялізацыя, якая праводзілася за кошт грабяжу калоній і бязлітаснай эксплаатацыі, заўсёды цягнула за сабой масавае збядненне працоўных і рост беспрацоўя, індустрыялізацыя совецкай краіны прывяла да поўнай і канчатковай ліквідацыі беспрацоўя ў СССР, да няўхільнага палепшання матэрыяльнага добрабыту і ўздыму культурнага ўзроўню насельніцтва.

Мільёны совецкіх людзей, не шкадуючы сіл, самаадданай працай узводзілі велічныя будынкі пяцігодак. Працоўны гераізм і самаадданасць мільённых мас рабочага класа былі бяспрыкладны. Ужо к 1937 г. 80% усёй прамысловай прадукцыі вытваралася на прадпрыемствах, пабудаваных або цалкам рэканструіраваных за першую і другую пяцігодкі, каля 90% усіх дзейнічаючых у сельскай гаспадарцы трактароў і камбайнаў былі зроблены совецкай прамысловасцю ў другой пяцігодцы. К 1940 г. быў у 12 разоў пераўзыйдзен узровень прамысловай вытворчасці 1913 года.

У выніку такіх тэмпаў развіцця прамысловасці Совецкі Саюз ліквідаваў стогадовую прамысловую адсталасць Расіі, абагнаў у адносінах аб'ёму прамысловай вытворчасці ўсе краіны Еўропы на працягу ўсяго каля 13 год. Гэта з'яўляецца трыумфам ленінска-сталінскай палітыкі індустрыялізацыі СССР.

> «Такі небывалы рост вытворчасці, — гаварыў тав. Сталін,—нельга лічыць простым і звычайным развіццём краіны ад адсталасці да прагрэса. Гэта быў скачок, пры дапамозе якога наша Радзіма ператварылася з адсталай краіны ў перадавую, з аграрнай у індустрыяльную».

Велізарны шлях індустрыяльнага развіцця прайшлі за гэты час рэспублікі, у мінулым адсталыя ў прамысловым развіцці аkраіны царскай Расіі.

Таварыш Сталін вучыў, што праўная нацыянальная роўнасць народаў, здабытая Кастрычніцкай рэвалюцыяй, з'яўляецца вялікім заваяваннем народаў, але яна сама па сабе



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

не магла вырашыць нацыянальнага пытання, калі не ліквідаваць фактычнай гаспадарчай і культурнай няроўнасці нацыянальнасцей Совецкага Саюза, няроўнасці, якая крыецца не толькі ў гісторыі народаў, але і ў палітыцы царызма і рускай буржуазіі.

Таварыш Сталін гаварыў аб тым, што гэта працяглы працэс, які патрабуе ўпартай і настойлівай работы і сапраўднай працяглай дапамогі рускага пролетарыята адсталым народам у справе іх гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Таму ў палітыцы індустрыялізацыі краіны таварыш Сталін асаблівую ўвагу ўдзяліў пытанню ўздыму эканомікі і культуры адсталых у мінулым нацыянальных акраін, усямернаму падцягванню іх у прамысловых адносінах.

У Беларусі, у мінулым пазбаўленай прамысловасці, апрача дробных, не меўшых сур'ёзнага значэння саматужных прадпрыемстваў, у гады індустрыялізацыі былі створаны новыя буйныя галіны прамысловасці, якіх не мела дарэволюцыйная Беларусь: машынабудаўнічая, аўтарамонтная, цэментная, хімічная, гідролізная і многія іншыя галіны прамысловасці. У гады сталінскіх пяцігодак у Беларусі створаны тысячы новых прадпрыемстваў.

Аб тэмпах індустрыялізацыі БССР можна меркаваць па тым, што сярэднегадавы прырост прадукцыі прамысловасці БССР за першую пяцігодку склаў 48,2% супроць сярэднегадавога прыросту па цэнзавай прамысловасці Саюза ў 21,6%.

Для характарыстыкі маштабаў, характару і значэння прамысловай вытворчасці можна ўказаць, што толькі за чатыры перадваенныя гады заводы станкабудаўніцтва выпусцілі 21 тыс. металарэжучых станкоў, а завод «Гомсельмаш» выпусціў 144 тыс. сартыровак, 12 тыс. малацілак і звыш 9 тыс. іншых сельскагаспадарчых машын.

Узніклі сотні новых прадпрыемстваў, вытвараючых прадукты і прадметы шырокага спажывання. У 1940 г. аб'ём вытворчасці харчовасмакавай прамысловасці перавышаў аб'ём усёй прамысловай вытворчасці 1913 г. у 5,7 раза, скураназабутковай — у 1,7 раза, малочнай — у 4 разы, дрэваапрацоўчай — у 1,7 раза.

У 1940 г. прамысловасць Беларусі вытварала прадукцыю на душу насельніцтва ў параўнанні з 1913 г.: электраэнергіі ў 96 разоў, кандытарскіх вырабаў — у 254 разы, абутку — у 23 разы, кансерваў — у 12 разоў, металавырабаў — у 30 разоў больш.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У 1940 г. прадукцыя прамысловасці ўсходніх абласцей вырасла амаль у 23 разы ў параўнанні з 1913 г., а па заходніх абласцях за паўтара года знаходжання ў складзе БССР аб'ём прамысловай вытворчасці амаль падвоіўся.

Удзельная вага прадукцыі БССР у агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці СССР вырасла ў 2,44 раза.

## III

За гады сталінскіх пяцігодак Совецкі Саюз паспяхова вырашыў самую цяжкую пасля перамогі рэволюцыі задачу социялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Сотні год сяляне Расіі жылі ў жабрачым становішчы, гнулі спіну, працуючы на памешчыкаў і кулакоў. Галеча і бескультур'е былі лёсам мільённых мас сялянства.

Дзякуючы ажыццяўленню сталінскай палітыкі калектывізацыі дробныя, раздробленыя, адсталыя сялянскія гаспадаркі былі пераатвораны ў самую буйную ў свеце соцыялістычную сельскую гаспадарку, аснаваную на шырокім прымяненні перадавой навукі і тэхнікі. Партыя большэвікоў і совецкая дзяржава вывелі сялянства на новую дарогу. Совецкае сялянства канчаткова і беспаваротна стала на шлях соцыялізма. Кулацтва — самы шматлікі эксплаататарскі клас у нашай краіне — было ліквідавана. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі падарвала апошнюю крыніцу капіталістычнай рэстаўрацыі. Таварыш Сталін гаварыў, што гэта

> «... найглыбейшы рэволюцыйны пераварот, скачок з старога якаснага стану грамадства ў новы якасны стан, роўназначны па сваіх выніках рэволюцыйнаму перавароту ў кастрычніку 1917 года».

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі забяспечыла нябывалы ўздым сельскагаспадарчай вытворчасці, яна азначала велізарны ўздым матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню совецкага сялянства.

Беларускае сялянства ў мінулым знаходзілася пад жорсткім палітычным, эканамічным і нацыянальным прыгнётам царызма, бязлітасна эксплаатавалася рускімі, польскімі і беларускімі памешчыкамі і капіталістамі.

Беларускае сялянства ў сваёй большасці было пазбаўлена зямлі. У дарэволюцыйнай Беларусі 4 000 памешчыкаў уладалі 66,5% усёй зямлі, а 664 000 сялянскіх двароў мелі толькі 33,5% і прытым горшай зямлі. Беззямелле і малазямелле, непасільныя падаткі і зверская эксплаатацыя з боку памешчыкаў і кулакоў абумовілі экстэнсіўнасць сялянскай сельскай

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

гаспадаркі і асуджалі беларускае сялянства на жабрацтва, голад і выміранне.

Селяніну Беларусі заўсёды нехапала зямлі, часта нехапала насення, нехапала коней, інвентара. Пераважнай большасці сялян ніколі нехапала свайго хлеба да новага ўраджаю. Лебяда і мякіна былі звычайным прыдаткам да хлеба.

> «Селянін, — пісаў Ленін,—быў даведзен да жабрацкага ўзроўню жыцця: ён жыў разам з жывёлай, апранаўся ў лахманы, харчаваўся лебядой. Сяляне галадалі хранічна і дзесяткамі тысяч паміралі ад голаду і эпідэміі ў час неўраджаяў, якія паўтараліся ўсё часцей і часцей».

Згодна даных, прыведзеных В. І. Леніным у яго кнізе «Развіццё капіталізма ў Расіі», у Беларусі сялянства было найбольш бедным і прыгнечаным. Працэс дыферэнцыяцыі і разарэння адбываўся тут больш інтэнсіўна, чым у іншых губернях Расіі.

Мінская губерня па колькасці сялян, якія разарыліся і пайшлі да кулакоў і памешчыкаў у батрацтва, займала першае месца ў дарэвалюцыйнай Расіі.

Сяляне тысячамі былі вымушаны ўходзіць ад убоства з Беларусі. Падлічана, што за 50 год да рэвалюцыі з Беларусі разышліся па ўсяму свету ў пошуках лепшай долі больш 1 387 000 чалавек, не лічачы пайшоўшых з імі дзяцей

Пры савецкай уладзе непазнавальна змянілася беларуская вёска. Сялянства Савецкай Беларусі, згуртаванае вакол партыі бальшэвікоў, рашуча стала на шлях калектыўнага вядзення гаспадаркі.

Суцэльная калектывізацыя і ліквідацыя кулацтва, як класа, азначалі пераход усіх зямель у рукі калгасаў. Гэтым быў падведзен вынік шматвяковай барацьбы беларускіх сялян за зямлю.

Калгасны лад забяспечыў нябачаны матэрыяльны і маральны рост калгаснай вёскі.

Беспярэпынна расла пасеўная плошча Беларусі. У 1940 г. пасеўная плошча калгасаў перавышала пасеўную плошчу 1913 г. на 625 тыс. гектараў. Гэта не лічачы прысядзібных участкаў калгаснікаў. Пасевы пшаніцы ўзраслі больш, чым у 5 разоў, тэхнічных культур — у 2,6 раза, бульбы — у 2 разы, шматгадовых траў — у 3,5 раза. У некалькі разоў павялічылася колькасць буйнай рагатай і дробнай жывёлы. Не было ў рэспубліцы калгаснага сялянскага двара, які-б не меў каровы, свіней, птушкі.

Калгасы Беларусі правялі такія буйнейшыя мерапрыем-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ствы ў сельскай гаспадарцы, як унядрэнне навейшай агратэхнікі, паўсямеснае ўвядзенне правільных севаабаротаў, ссяленне хутароў, асушэнне соцень тысяч гектараў балотных зямель і ператварэнне іх у высокаўраджайныя нівы, развіццё вытворчасці і павелічэнне колькасці ўносімых у глебу ўгнаенняў.

З кожным годам усё большы лік калгасаў дабіваўся высокіх ураджаяў. Так, напрыклад, калі ўраджаі зерневых звыш 10 цэнтнераў у 1938 г. атрымалі 905 калгасаў, то ў 1939 г. такія ўраджаі атрымаў 1 651 калгас, а ў 1940 г.—2 683 калгасы. У Беларусі з'явіліся сотні калгасаў, якія давалі рэкордныя для Совецкага Саюза ўраджаі, з'явіліся калгасы-мільянеры.

Сельская гаспадарка Беларусі, якая прагрэсіравала з такім поспехам, давала штогод буйны прырост прадукцыі. З 1938 г. па 1941 г. збор зерневых у калгасах БССР вырас на дзесяткі мільёнаў пудоў. Валавы збор бульбы з 1938 па 1941 г. павысіўся на 71 мільён пудоў.

У 1940 г. па ініцыятыве таварыша Сталіна была распрацавана праграма грандыёзных работ па асушэнню 4 мільёнаў гектараў балот Беларусі. Воляй партыі большэвікоў, совецкага ўрада і вялікага друга працоўных таварыша Сталіна беларускія балоты, якія з'яўляліся ў мінулым крыніцай хвароб, бездарожжа, бескультур'я і галечы, павінны былі ператварыцца ў квітнеючыя палі і лугі — крыніцу багацця калгасаў і калгаснікаў.

З велізарным энтузіязмам увесь беларускі народ прымаў удзел у гэтай рабоце. К пачатку 1941 года было асушана 270 тыс. *га* балот; на плошчы звыш 1 мільёна гектараў былі створаны ўмовы для больш прадукцыйнага скарыстання зямель. Сотні калгасаў, асушыўшы буйныя масівы балотных зямель, сталі атрымліваць на іх выдатныя не толькі для Беларусі, але і для ўсяго Совецкага Саюза ўраджаі.

Социялістычная сельская гаспадарка, зламаўшы перашкоды і абмежаванні для развіцця, якія існавалі ва ўмовах аднаасобнай гаспадаркі, нястрымна і бурна ішла ўперад, памнажаючы багацце совецкага народа і дзяржавы.

* * *

Бурны рост прамысловасці і ўздым сельскай гаспадаркі ў гады сталінскіх пяцігодак прывялі да росту гарадоў Беларусі і змяненню іх аблічча. Вялася вялікая работа па рэканструкцыі сталіцы Беларусі — Мінска, гарадоў Гомеля, Віцебска, Магілева і іншых. Узніклі сотні шматкватэрных жылых будын-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

каў, клубаў, магазінаў, вакзалаў. У гор. Мінску за гады савецкай улады пабудавана добраўпарадкаванага жылля ў два разы больш, чым увесь яго дарэвалюцыйны жылы фонд.

Значна рэканструіравана гарадская комунальная гаспадарка. Замест старой конкі ў Мінску пабудаван трамвай, арганізаван унутрыгарадскі аўтобусны рух. У найбольш буйных гарадах Беларусі пабудаваны вадаправод і каналізацыя.

Колькасць гарадскога насельніцтва Беларусі за гады савецкай улады вырасла больш чым у два разы, а насельніцтва горада Мінска вырасла ўтрая.

## IV

За гады савецкай улады ў нашай краіне адбылася ў сапраўдным сэнсе культурная рэвалюцыя. Царская Расія была краінай цемры і невуцтва. Пераважная большасць яе насельніцтва была непісьменная. Адукацыя была даступна толькі нязначнай частцы насельніцтва — прывілеяваным класам. У СССР ліквідавана непісьменнасць і ўведзена ўсеагульнае абавязковае пачатковае навучанне. Краіна пакрылася густой сеткай школ, вышэйшых навучальных устаноў, клубаў, хат-чытальняў, бібліятэк. Лік студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў савецкай краіны перавышае лік студэнтаў вышэйшых навучльных устаноў усіх краін Еўропы разам узятых. Выраслі за гады савецкай улады літаратура і мастацтва.

Адным з найвялікшых вынікаў культурнай рэвалюцыі з'явілася нараджэнне народнай соцыялістычнай інтэлігенцыі.

Рэвалюцыя адкрыла новую эпоху ў развіцці навукі. Савецкая краіна з поўным правам можа сказаць, што ў выніку перамогі соцыялізма яна скінула з сябе аблічча цемры і бескультур'я. Яна стала ачагом соцыялістычнай цывілізацыі, носьбітам самай перадавой культуры.

Царызм душыў нацыянальную культуру народаў Расіі. У Беларусі не было школ і газет на беларускай мове, не было тэатраў, не было наогул ні адной вышэйшай навучальнай установы. Больш 80% беларускага насельніцтва было непісьменным.

Савецкая рэвалюцыя падняла ўсе народы нашай краіны да культурнага жыцця, дала магчымасць усім народам СССР развіваць сваю нацыянальную культуру. Апіраючыся на брацкую дапамогу вялікага рускага народа, беларускі народ дабіўся велізарных поспехаў у справе культурнага будаўніцтва.

Пры савецкай уладзе ў рэспубліцы стала больш 11 600



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

школ, з іх 11 294 школы на беларускай мове. Па размаху сеткі народнай асветы Беларусь абагнала самыя перадавыя капіталістычныя краіны. Напрыклад, у 1938/39 навучальным годзе на 1000 чалавек насельніцтва ў Беларусі прыпадала вучняў усіх агульнаадукацыйных школ больш на 63,8 чалавек, а вучняў сярэдніх школ — на 3,3 чалавек, чым у Англіі.

К 1940 г. была цалкам ліквідавана непісьменнасць — векавое зло народа.

Беларусь не мела да рэвалюцыі масавых народных бібліятэк, а ў цяперашні час мае фонд кніг у 4,5 млн. тамоў, што складае больш палавіны кніжнага фонда масавых бібліятэк усёй дарэвалюцыйнай Расіі.

Калі да рэвалюцыі на беларускай мове кнігі не выдаваліся, то ў 1939 г. вышла больш 11 млн. кніг.

У Беларусі не было ні адной газеты і часопіса на беларускай мове, выходзіла толькі некалькі губернскіх «ведамасцей»; у цяперашні час мы маем 9 рэспубліканскіх, 11 абласных, 174 гарадскіх і раённых, а ўсяго 201 газету, з іх 162 газеты на беларускай мове, і 6 часопісаў.

У Беларусі не было ні адной вышэйшай навучальнай установы, а ў цяперашні час у нас ёсць 26 вышэйшых навучальных устаноў, 110 тэхнікумаў і спецыяльных сярэдніх навучальных устаноў, у якіх навучаецца больш 46 000 студэнтаў. Гэтыя навучальныя ўстановы адыгралі велізарную ролю ў падрыхтоўцы за гады савецкай улады нацыянальнай савецкай інтэлігенцыі.

У рэспубліцы выкаваны нацыянальныя кадры. Дзяржаўныя дзеячы, савецкія і партыйныя работнікі, буйныя арганізатары народнай гаспадаркі — яны самаадддана працуюць на шчасце народа ва ўсіх звеннях дзяржаўных, партыйных і гаспадарчых органаў рэспублікі і многія з іх — у органах і ўстановах Саюза ССР, у арміі і флоце.

З'явіліся выдатныя дзеячы навукі і культуры, вучоныя і даследчыкі, прафесары і дацэнты, дактары і кандыдаты навук.

Рост культуры і навукі ў БССР, рост нацыянальных кадраў дазволіў вырашыць пытанне аб арганізацыі Акадэміі навук — вышэйшай навучальнай установы рэспублікі.

Да рэвалюцыі ў Беларусі не было ўмоў для росту і развіцця народных талентаў. Не было прафесіянальнай мастацкай, музычнай асветы, не было мастацкіх устаноў і калектываў, дзе можна было-б народным талентам прымяніць і развіць свае здольнасці. У Беларусі не было ні аднаго прафе-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

сіянальнага тэатра. Народ не меў літаратуры на беларускай мове, за выключэннем паасобных твораў.

За гады совецкай улады расцвілі ўсе віды мастацтва і літаратура таленавітага народа. Узніклі тэатры, музеі, дамы народнай творчасці. Вырас велізарны атрад новай беларускай совецкай інтэлігенцыі, паднятай з народных нізоў, — вучоныя, пісьменнікі, педагогі, артысты, мастакі, кампазітары.

Калі да рэволюцыі налічваліся адзінкі беларускіх пісьменнікаў і паэтаў і сярод іх толькі Янка Купала і Якуб Колас таленавіцейшыя паэты, узняўшыя сваю творчасць да вяршынь у мастацкіх адносінах і социяльным значэнні, то пасля рэволюцыі ўзнік буйны атрад пісьменнікаў і паэтаў, узнікла рознабаковая, багатая, жыццерадасная літаратура.

Беларуская совецкая літаратура і мастацтва раслі і загартоўваліся ў эпоху вялікіх социялістычных пераўтварэнняў, раслі і загартоўваліся ў барацьбе з буржуазнымі нацыяналістамі, гэтымі заўзятымі ворагамі беларускага народа.

Беларускае социялістычнае мастацтва і літаратура раслі і развіваліся, следуючы лепшым традыцыям рускай класічнай і сучаснай рускай совецкай літаратуры і мастацтва. Беларуская совецкая літаратура—нацыянальная па форме і социялістычная па зместу—адлюстроўвае жыццё свайго народа, яго барацьбу, яго працу, нацыянальную своеасаблівасць яго быту, яго псіхіку. Гэта мастацтва і літаратура народа, які вышаў на шырокія прасторы жыцця, скінуў з сябе аковы шматвяковага социяльнага і нацыянальнага прыгнечання. Гэта літаратура і мастацтва народа, які ўпершыню ў гісторыі далучыўся да актыўнага дзяржаўнага і грамадскага жыцця, упершыню ў гісторыі атрымаў шырокія магчымасці развіцця сваёй нацыянальнай культуры, упершыню ў гісторыі пазнаў радасць стваральнасці, радасць свабоднай творчай працы.

Беларуская совецкая літаратура і мастацтва адлюстравалі ў сабе былую горач шматвяковага прыгнечання народа і разам з тым яны з'яўляюцца мастацтвам і літаратурай сапраўднага аптымізма, вялікага жыццесцверджання, сцверджання жыватворных ідэй партыі Леніна—Сталіна.

У процівагу буржуазнай літаратуры і мастацтву беларуская совецкая літаратура і мастацтва сцвярджаюць здаровы пачатак жыцця, глыбокую веру ў будучыню, тржаство высокіх і благародных ідэй комунізма. Яны з'яўляюцца носьбітамі ідэй совецкага патрыятызма, былі вернай зброяй пар-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

тыі і народа ў іх барацьбе за сацыялістычнае грамадства, у іх барацьбе супроць усякіх пасяганняў на нашу сацыялістычную дзяржаву, зброяй у барацьбе супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

* * *

Сотні год Беларусь тамілася пад уладаю іншаземных захопнікаў, цярпела прыгнечанне памешчыкаў і капіталістаў, сотні год стрымлівалася развіццё мовы, нацыянальнай культуры, асветы.

З часу Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, калі Беларусь упершыню за сваю шматвяковую гісторыю з рук вялікіх Леніна і Сталіна атрымала дзяржаўнасць, рэспубліка за 30 год прайшла велізарны шлях дзяржаўнага, палітычнага, эканамічнага і нацыянальнага развіцця, развіцця мовы, літаратуры, навукі і мастацтва. За 30 год Савецкая Беларусь з адсталай у эканамічных і культурных адносінах краіны з прыгнечаным беднасцю насельніцтвам ператварылася ў квітнеючую, развітую ў эканамічных адносінах дзяржаву.

Такія вось кароткія вынікі гіганцкай работы, праведзенай за гады савецкай улады, у рэзультаце якіх Савецкі Саюз стаў магутнейшай дзяржавай, а дабрабыт і культура народа дасягнулі небывалага росквіту.

22 чэрвеня 1941 года мірнае будаўніцтва было перарвана. Фашысцкая Германія вераломна напала на Савецкі Саюз. У сілу навязанай нам вайны краіна ўступіла ў смяртэльную схватку з небяспечным, каварным ворагам — нямецкім фашызмам.

Нямецкія войскі абрушылі на Беларусь усю сілу першага ўдару. Апіраючыся на рэсурсы і тэхніку ўсёй Заходняй Еўропы, скарыстоўваючы перавагі раптоўнага нападу, вораг заняў частку тэрыторыі Савецкага Саюза. Радзіма апынулася ў найвялікшай небяспецы, ішло пытанне аб жыцці і смерці савецкай дзяржавы, аб тым, быць народам Савецкага Саюза свабоднымі або ўпасці ў заняволенне.

У гэты грозны час у жыцці савецкай дзяржавы таварыш Сталін прыняў на сябе вярхоўнае кіраўніцтва ваеннымі сіламі краіны. У сваім гістарычным выступленні па радыё 3 ліпеня 1941 г. таварыш Сталін даў усяму савецкаму народу баявую праграму дзеянняў, мабілізаваў усе сілы народа для дасягнення перамогі над ворагам.



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Беларускі народ разам з усімі народамі нашай краіны уступіў у цяжкую, працяглую барацьбу з захопнікамі за чэсць і незалежнасць Савецкай Радзімы. Сыны беларускага народа ў радах Савецкай Арміі біліся на ўсіх франтах Вялікай Айчыннай вайны.

У гістарычнай бітве пад Масквой, у грохаце сталінградскай бітвы, у бітвах пад Белгарадам і Орлом, ля Харкава і Дняпра, пад Ленінградам і на Украіне, у Польшчы і на Балканах, на Далёкім Усходзе і на тэрыторыі фашысцкай Германіі—усюды гераічныя сыны беларускага народа плячом к плячу з рускімі, украінцамі і іншымі народамі з бяспрыкладнай мужнасцю біліся з заклятымі ворагамі — нямецкімі захопнікамі за сваю Савецкую Радзіму.

У тылу нямецкай арміі, на часова акупіраваных землях Савецкай Беларусі, беларускі народ, ахоплены непрымірымай смяртэльнай нянавісцю да нямецкіх захопнікаў, па закліку таварыша Сталіна ўзняўся магутнай сілай на абарону Савецкай Радзімы, сваёй свабоды, чэсці і жыцця.

Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі, выконваючы гістарычныя ўказанні таварыша Сталіна, арганізавала і ўзначаліла ўсенародны партызанскі рух у Беларусі. Партызанскі рух, ахапіўшы велізарныя масы насельніцтва, вырас у буйную сілу і аказаў вялікую дапамогу Савецкай Арміі ў разгроме немцаў.

Каласальная сіла партызанскага руху ў Беларусі заключалася ў тым, што ён быў усенародным рухам, апіраўся на ўсё насельніцтва Беларусі, у тым, што актыўнасць і ініцыятыва народных мас узначальваліся большэвіцкімі арганізацыямі. Сіла партызанскага руху заключалася ў тым, што барацьбой беларускага народа кіраваў вялікі правадыр таварыш Сталін.

Тысячы выдатных большэвікоў, партыйных і непартыйных, згуртоўвалі народ, узнімалі яго на барацьбу, умацоўвалі веру народа ў свае сілы, у сілу Савецкай Арміі, савецкай улады, у нашу перамогу.

Велізарную ролю ў партызанскай барацьбе з захопнікамі адыграла цудоўная, палкая, патрыятычная моладзь Беларусі і яе слаўны авангард і правадыр—ленінска-сталінскі комсамол Беларусі.

Гэта незгасальная вера народа ў сілу партыі, улады, дзяржавы, якімі кіруе таварыш Сталін, з'явілася невычарпальнай, жыватворнай крыніцай партызанскага руху.

Больш 300 тысяч узброеных і абучаных у атрады і

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

брыгады партызан, пры падтрымцы ўсяго народа, вялі на ўсёй тэрыторыі барацьбу супроць нямецкіх захопнікаў.

У Беларусі ўсенародная партызанская вайна ішла паўсямесна: у гарадах, сёлах, на чыгуначных камунікацыях, супроць усіх ваенных, палітычных і эканамічных мерапрыемстваў акупантаў.

Немцы пацярпелі не толькі ваеннае, але і маральна-палітычнае паражэнне. Ідэалогія звярынага нацыяналізма і спробы немцаў увесці нацыянальны разлад сярод народаў СССР пацярпелі крах.

За гады Вялікай Айчыннай вайны народ яшчэ мацней згуртаваўся вакол совецкай улады, большэвіцкай партыі і таварыша Сталіна, паказаў адданасць Радзіме, маналітнасць і маральна-палітычнае адзінства. Яшчэ мацней развілася і ўмацавалася дружба беларускага народа з рускім народам, вырасла нацыянальная самасвядомасць беларускага народа, глыбей стала ўсенароднае разуменне значэння СССР, як гарантыі дзяржаўнага існавання Совецкай Беларусі.

Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі ў гэтай барацьбе ўмацавала свае сувязі з масамі, вырасла і загартавалася.

Такія важнейшыя палітычныя вынікі барацьбы беларускага народа пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У выніку поўнай ваеннай, эканамічнай і палітычнай перамогі СССР над германскім фашызмам і японскім імперыялізмам наша краіна, наш народ атрымалі магчымасць пераходу да мірнай працы.

Перамога СССР азначае, што перамог самы перадавы ў свеце совецкі грамадскі лад, народжаны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыяй.

Перамога СССР азначае, што перамог совецкі дзяржаўны лад, які аказаўся здольным у самы крытычны перыяд мабілізаваць найвялікшыя рэзервы і забяспечыць патрэбнасці вайны айчыннай вытворчасцю, узняць увесь народ Совецкага Саюза на гераічныя ваенныя і працоўныя подзвігі, дзяржаўны лад, кіруючай сілай якога з'яўляецца комуністычная партыя большэвікоў, партыя Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам якой увесь многанацыянальны Совецкі Саюз згуртаваўся ў адзіны баявы лагер.

• Перамога Совецкага Саюза азначае, што перамаглі совецкія ўзброеныя сілы, перамагла Совецкая Армія пад геніяльным кіраўніцтвам вялікага палкаводца таварыша Сталіна.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Перамога Совецкага Саюза азначае гістарычную перамогу ленінізма, азначае найвялікшую перамогу Сталінскага генія.

Перамога Совецкага Саюза дасягнута на аснове папярэдняй падрыхтоўкі ўсіх матэрыяльных магчымасцей краіны да актыўнай абароны, на аснове паслядоўнага правядзення палітыкі індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Пасля пераможнага сканчэння Вялікай Айчыннай вайны, вызваліўшыся пры дапамозе ўсяго совецкага народа і яго вялікай непераможнай арміі ад нямецкіх захопнікаў, беларускі народ прыступіў да мірнага будаўніцтва, аднаўлення народнай гаспадаркі і залечвання цяжкіх ран, нанесеных вайной.

Цяжкую карціну прадстаўляла Совецкая Беларусь пасля вызвалення. Захопнікі па-варварску знішчылі плады шматгадовай працы беларускага народа. За ўсю сваю гісторыю Беларусь не ведала яшчэ такіх нашэсцяў, якія-б унеслі столькі чалавечых жыццяў і прычынілі такія нечуваныя спусташэнні гарадам, сёлам, прамысловасці, транспарту і сельскай гаспадарцы.

Гарады, фабрыкі, заводы, калгасы, тысячы населеных пунктаў ляжалі ў руінах. Машыны, сродкі і прылады вытворчасці былі знішчаны або вывезены. Жывёла знішчана і ўгнана. Пасевы знішчаны.

Насельніцтва, аграбленае немцамі, не мела прадуктаў, прадметаў першай неабходнасці і хатняга ўжытку. Больш паўтара мільёна чалавек у сельскай мясцовасці пазбавіліся жылля і ў большасці пражывалі ў зямлянках. Гарадское насельніцтва ў большасці сваёй таксама апынулася без жылля і ў цяжкіх санітарна-гігіенічных умовах. Велізарная колькасць насельніцтва хварэла тыфам, дызентэрыяй, малярыяй і іншымі хваробамі.

Перад урадам і комуністычнай партыяй Беларусі паўстала задача неадкладнага аказання матэрыяльнай дапамогі насельніцтву, арганізацыі медыцынскага абслугоўвання, ліквідацыі масавых захворванняў і эпідэмій, разгортвання гандлю і забеспячэння насельніцтва неабходнымі таварамі і прадметамі хатняга ўжытку, арганізацыі будаўніцтва жылля для насельніцтва сёл і гарадоў і разгортвання шырокім фронтам аднаўлення прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Беларускаму народу, як заўсёды, зараз-жа прыйшоў на дапамогу Саюзны Урад, ЦК ВКП(б), таварыш Сталін. На

Др 6907
ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

дапамогу прышлі брацкія рэспублікі. Гэта неацанімая дапамога прыходзіла ў першыя-ж дні, услед за вызваленнем, і яна дазваляла ліквідаваць голад, эпідэмічныя хваробы, накарміць і прыстроіць сірот, аказаць дапамогу меўшым у ёй патрэбу. Гэта вялікая дапамога пашыралася з кожным днём і месяцам, і яна дала магчымасць беларускаму народу з першых дзён вызвалення разгарнуць грандыёзную аднаўленчую работу ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і культуры. Гэтая дапамога была выключна ўсебаковай і небывалай па размерах.

Бесперапынна і ўсё пашыраючыся, у рэспубліку накіроўваліся матэрыяльныя рэсурсы для аднаўлення яе гаспадаркі.

З моманту вызвалення рэспубліка атрымала больш 50 тыс. адзінак прамысловага абсталявання (металарэжучых станкоў, друкарскіх машын, турбін, генератараў, электраматораў і т. д.), вялікую колькасць трактараў і аўтамашын. Для аднаўленчых работ за гэтыя гады атрымана велізарная колькасць матэрыялаў: металу, цэменту, лесу, шкла і т. д. Сельская гаспадарка атрымала ў выглядзе дапамогі звыш 15 тыс. сельгасмашын, 128 тыс. коней, 150 тыс. буйнай рагатай жывёлы. Калгасы і калгаснікі, якія мелі патрэбу, атрымлівалі штогод насенныя пазыкі.

Велізарная дапамога была аказана рэспубліцы ў аднаўленні культурных устаноў, бібліятэк, навучальных устаноў. Яшчэ ў 1944 годзе, калі ў Беларусі ўся паліграфічная база была знішчана, у Маскве ўжо друкаваліся кнігі і падручнікі для школьнікаў на беларускай мове. За тры гады школы БССР атрымалі толькі з Масквы больш 3 млн. падручнікаў. На працягу некалькіх месяцаў для Беларусі ў Грузіі, Ленінградзе, Свердлоўску было сабрана 5 млн. тамоў палітычнай і мастацкай літаратуры, скамплектавана 3 900 бібліятэк для хат-чытальняў. Дапамога беларускаму народу выявілася асабліва ярка ў тым, што ў рэспубліцы, цяжка разоранай вайной, з народнай гаспадаркай, далёка адкінутай назад і, значыцца, не маючай дастаткова ўласных сродкаў і рэсурсаў для аднаўлення, пяцігадовы план прадугледжвае агульны аб'ём капітальных работ за пяцігоддзе ў 7 млрд. рублёў, што перавышае аб'ём капіталаўкладанняў першай, другой і трэцяй пяцігодак узятых разам. У гэтых мільярдах заключана праца ўсяго савецкага народа, заключана яго вялікая дапамога беларускаму народу.

У любых іншых умовах, у любой капіталістычнай краіне, разбурэнні, падобныя да тых, якім падвергнута Совецкая Бе-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ларусь, азначалі-б дзесяцігоддзі голаду, галечы і нястач для працоўных мас гэтых краін. Яны немінуча, гэтыя краіны, папалі-б у кабалу іншых, эканамічна больш магутных краін і страцілі-б сваю самастойнасць.

Хіба не бачым мы ў сучаснай міжнароднай рэчаіснасці пацверджанне гэтаму ў выглядзе так званых «планаў Маршала», «дактрын Трумэна» і г. д., якія пад выглядам дапамогі хочуць скарыстаць цяжкое становішча малых, разораных вайной краін для эканамічнага, а потым і палітычнага заняволення, што ўваходзіць этапам у іх брэдавы план сусветнага панавання.

З бясконцай пагардай беларускі народ адносіцца да падобных планаў, іх аўтараў і носьбітаў і з вялікім спачуваннем адносіцца да краін, якія знаходзяць у сабе мужнасць і сілу працістаяць гэтым планам і адстайваць сваю незалежнасць і тым самым перашкаджаць развязванню вайны, такой пажаданай англа-амерыканскім імперыялістам.

У Совецкай Беларусі на аснове сталінскага плана аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі, пад'ёму матэрыяльнага добрабыту і культуры народа, апіраючыся на магутную эканамічную аснову Совецкага Саюза, ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі ідзе велізарны стваральны аднаўленчы працэс.

Шырокім фронтам ідзе аднаўленне прамысловых прадпрыемстваў саюзнай, рэспубліканскай і мясцовай прамысловасці. Ужо адноўлена і пушчана некалькі тысяч буйных, сярэдніх і дробных прадпрыемстваў.

Узровень прамысловай вытворчасці ўвесь час узрастае. У 1944 г., у першы год вызвалення, прадукцыю давалі нешматлікія адноўленыя прадпрыемствы. У 1945 г. вытворчасць ужо значна ўзрасла. Былі пушчаны ўжо шматлікія, у тым ліку рад буйных прадпрыемстваў, і выпуск прадукцыі ўжо стаў адчувальным. Рост прадаўжаўся і далей.

Так, у 1946 г. выпуск прадукцыі ў адносінах да 1945 г. складаў 155%. У 1947 г. выпуск прадукцыі ў адносінах да 1946 г. згодна дзяржаўнага плана павінен скласці 132%.

На прадпрыемствах рэспублікі разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне плана вытворчасці 1947 г. Прадпрыемствы рэспубліканскага падпарадкавання Міністэрства мясцовай прамысловасці выканалі гадавую праграму 31 кастрычніка, даўшы 76% прыросту к 1946 г. Паспяхова ідуць да выканання праграмы прадпрыемствы і раду іншых міністэрстваў.

Датэрмінова, к гадавіне Кастрычніка, выканалі план пра-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

мысловыя прадпрыемствы гарадоў Мінска, Магілева, Барысава і многія сотні іншых прадпрыемстваў рэспублікі.

Такім чынам, у выніку велізарных мер дапамогі, у выніку аднаўленчых работ уступаюць у строй усё новыя і новыя фабрыкі і заводы, і ўзровень вытворчасці бесперапынна ўзрастае.

Побач з аднаўленнем разбураных прадпрыемстваў, у рэспубліцы разгарнулася новае будаўніцтва такіх новых буйных аб'ектаў, як трактарны, аўтамабільны, веласіпедны, лакамабільны, станкабудаўнічыя, інструментальныя і іншыя буйныя заводы. У саставе мясцовай прамысловасці будуюцца: Магілеўскі металакамбінат, трубаліцейны завод з пракатнымі станамі, станкабудаўнічыя заводы і заводы сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва. Тэкстыльная прамысловасць абагачаецца такімі новымі прадпрыемствамі, як каўрова-плюшавы і тонкасуконны камбінат.

Гэтыя прамысловыя прадпрыемствы адыграваюць велізарную ролю ў справе далейшай індустрыялізацыі Беларусі, акажуць значны ўплыў на хутчэйшае аднаўленне ўсёй народнай гаспадаркі, на будаўніцтва ў гарадах і сёлах, на аднаўленне сельскай гаспадаркі і на стварэнне нармальных умоў для жыцця насельніцтва.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы